# ГОРАЧА ВІНШУЕМ ВАС З ВЫСОКАЙ УРАДАВАЙ УЗНАГАРОДАЙ, ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

За вялікія заслугі ў падрыхтоўцы спецыялістаў і развіцці навукі Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР Указам ад 15 верасня 1961 года па **Беларускай ССР** узнагародзіў:

### ОРДЭНАМ ЛЕНІНА

**Годнева** Ціхана Мікалаевіча—прафесара Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**Ярмоленку** Мікалая Фёдаравіча—прафесара, загадчыка кафедры Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**Некрашэвіча** Ілью Рыгоравіча—прафесара, загадчыка кафедры Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**Сеўчанку** Антона Нікіфаравіча—прафесара, рэктара Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

### ОРДЭНАМ ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА

**Малышава** Андрэя Якаўлевіча—дацэнта, прарэктара Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**Сцяпанава** Барыса Іванавіча—прафесара, загадчыка кафедры Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**Сцяпанава** Васіля Іванавіча—прафесара, загадчыка кафедры Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

### ОРДЭНАМ «ЗНАК ПАШАНЫ»

**Булацкага** Рыгора Васільевіча—дацэнта, загадчыка кафедры Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**Івашына** Уладзіміра Рыгоравіча—дацэнта, дэкана факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**Лушчыцкага** Івана Мікалаевіча—прафесара, загадчыка кафедры Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**Паўлючэнку** Міхаіла Міхайлавіча—прафесара, загадчыка кафедры Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**Супруненку** Дзмітрыя Аляксеевіча — прафесара, дэкана факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**Шмыгава** Фрола Парфір'евіча—дацэнта, загадчыка кафедры Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

### МЕДАЛЕМ «ЗА ПРАЦОЎНУЮ ДОБЛЕСЦЬ»

**Абецадарскага** Лаўрэнція Сямёнавіча—дацэнта, загадчыка кафедры Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**Ларчанку** Міхаіла Рыгоравіча—прафесара, дэкана факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**Савачкіна** Пятра Захаравіча—дацэнта, дэкана факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

### МЕДАЛЕМ «ЗА ПРАЦОЎНУЮ АДЗНАКУ»

**Жыркевіча** Міхаіла Іванавіча—дацэнта, загадчыка кафедры Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**Павецьева** Гаўрылу Аляксеевіча—дацэнта, прарэктара Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**Цішчанку** Івана Рыгоравіча—дацэнта, дэкана факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**Тамашэвіча** Уладзіміра Антонавіча—дацэнта, загадчыка кафедры Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**Трухана** Івана Іванавіча—дацэнта, дэкана факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 26 (457) | Серада, 27 верасня 1961 г. | Цана 1 кап.

*У пяцікурснікаў пачалася практыка*

# Першыя ўрокі—першыя крокі

*У СТУДЭНТАЎ пятых курсаў пачалася практыка. Біёлагі і філолагі праходзяць яе ў школах, хімікі і фізікі—на прадпрыемствах.*

*Мы пабывалі на ўроку прыродазнаўства ў 9 сярэдняй школе.*

*Да званка застаецца некалькі мінут. Таіса Сіняк яшчэ і яшчэ раз перачытала план-канспект, узяла класны журнал. Дзяўчына хвалюецца. Ды і як тут не хвалявацца, калі першы раз у жыцці ідзеш на ўрок у ролі настаўніка!*

*...Час акуратна перагортвае старонкі жыцця. Хутка пралятаюць і губляюцца ў памяці тыя, што падобны адна на другую. Але ёсць падзеі, што помняцца ўсё жыццё. Такой падзеяй у жыцці Таісы з'явіўся гэты ўрок.*

*Празвінеў званок. Змоўклі вясёлыя дзіцячыя галасы, у калідорах стала незвычайна ціха.*

*Таіса на нейкі момант прыпынілася каля класнага пакою з шыльдачкай «5-а». Як сустрэнуць яе вучні? Ці зможа яна пераадолець хваляванне? Што скажуць пасля ўрока метадыст, студэнты-аднакурснікі, якія ўжо размясціліся на апошніх партах, на «камчатцы»? Гэтыя пытанні хвалявалі практыкантку.*

*Клас прывітаў яе дружным уставаннем.*

*— Сядайце,—спакойна сказала студэнтка, але ў голасе адчуваліся ноткі хвалявання.— Хто сёння дзяжурны?*

*З сярэдняга раду ўсталі адразу чатыры вучні.*

*Вось ён, першы сюрпрыз, першая нечаканасць, аб якой нічога не гаворыцца ў методыцы.*

*Таіса не разгубілася.*

*—Не ўсе хорам. Хто-небудзь адзін скажа, каго сёння няма ў класе.*

*Дзяўчынка з белым банцікам у косах назвала прозвішчы. Урок пачаўся. Праверка дамашняга задання прайшла паспяхова. Усе выкліканыя вучні адказвалі ўпэўнена і змястоўна.*

## Рэпартаж

*Але галоўнае ўперадзе. Ад таго, як пройдзе тлумачэнне новага матэрыялу, у значнай ступені залежыць якасць урока. Спакойна і дзелавіта, як быццам ужо даўно знаёмая з класам, Таіса пачала расказваць аб суквеццях вішні, цыбулі, укропу. У даступнай форме пры дапамозе нагляднага матэрыялу растлумачыла складаныя біялагічныя назвы і тэрміны. Калі слухаеш Таісу Сіняк, то адчуваеш, чамусьці, што гэта не студэнтка-практыкантка, а сапраўдная настаўніца, якая вядзе вучняў да новых вяршынь ведаў.*

*Пры замацаванні матэрыялу вучні таксама адказалі на ўсе пастаўленыя пытанні. Зараз можна не сумнявацца, што ўрок прайшоў удала, мэта дасягнута. Доказ—адказы вучняў.*

*Пасля ўрока мы гутарылі з Таісай. Вось што яна расказала:*

*— Сярэднюю школу я закончыла яшчэ ў 1953 годзе. Працавала сакратаром сельскага Савета. Даўно марыла стаць настаўніцай-біёлагам. Думаю, што я не памылілася ў выбары прафесіі.*

*Свае ўражанні аб уроку выказала выкладчыца універсітэта Вера Фёдараўна Цераховіч:*

*— Калі ўлічваць, што гэта першы ўрок у жыцці Таісы, то можна з упэўненасцю сказаць, што яна будзе добрым педагогам. Тое ж можна сказаць і аб уроках Т. Даньковіч, Н. Матусевіч, Н. Артамонавай і іншых практыкантаў біяфака.*

*Першыя ўрокі ў школе становяцца першымі жыццёвымі крокамі студэнтаў. Няхай яны будуць паспяховымі!*

А. ДЗЕМІДЗЕНКА.

# СТУДЭНТЫ ЧАКАЮЦЬ НАСЦЕНГАЗЕТ

*Вялікая ўвага на старонках выйшаўшых насценных газет ўдзяляецца навічкам, першакурснікам, самым маладым членам нашага калектыву. Але, што найбольш радуе, навічкі прымаюць актыўны ўдзел у рабоце насценных газет. «Слова філолага» змяшчае выступленні першакурснікаў Г. Круглова, М. Абабуркі, газета «Географ»—Белікавай і Лень; «Студэнт гістфака»—матэрыялы Г. Баркуна, М. Марчанкі і г. д. Што ж, вельмі добра! Гэта, напэўна, для першакурснікаў напісаў К. Камейша такія радкі:*

*Будзем без хістанняў*
*пачынаць*
*Новую дарогу, мой*
*равеснік!*

*Верш К. Камейшы змешчаны ў першым нумары «Слова філолага».*

*Насценгазета «Географ» памясціла цікавае выступленне Л. Гудзь аб паездцы на Карпаты.*

*А вось насценгазета «Студэнт гістфака» друкуе вельмі важны артыкул студэнта 4-га курса Кардымона, які ўскрывае недахопы студэнцкай навуковай работы, аб тым, што да гэтага часу не распачалі сваёй работы гурткі па гісторыі СССР і гісторыі БССР, аб тым, што неабходна павысіць узровень навуковай работы сярод студэнтаў гістфака.*

*Цяпер аб іншых факультэтах. Вось ужо амаль месяц прайшоў з таго часу, як першы званок абвясціў аб пачатку новага навучальнага года. Пачалася вучоба — гарачая пара для студэнтаў. Але калі гаварыць аб насценгазетах, то, на жаль, яны выйшлі не на ўсіх факультэтах. Так, на 23 верасня не выпусцілі насценгазет матэматычны, фізічны, біялагічны, юрыдычны факультэты. Месцы, дзе павінны вісець газеты гэтых факультэтаў, пустуюць. Рэдкалегіі ўпамянутых насценгазет, як відаць, не прыступілі яшчэ да работы. А студэнты, між тым, чакаюць сваіх насценгазет.*

Ул. СТАРЧАНКА.

**РЭПАРТАЖ З КАЛГАСА ІМЯ СТАЛІНА ДЗЯРЖЫНСКАГА РАЁНА ЧЫТАЙЦЕ НА 2-ой СТАР.**

## *Чароўныя словы*

Я ішоў на іспыты
У вайсковым адзенні.
Валасы пераблытаў
Вецер шоўкам праменняў.

Мінск усмешкаю ветлай
Быццам сына вітае,
У вачах яго светлых
Твае словы чытаю.

Як пісаў сачыненне
Роднай матчынай мовай,
Пра маё пакаленне
Прыгадаў тыя словы.

Пуцявіну да ведаў
Я з кагорты вайсковай
Адшукаў: моцна ведаў
Твае, партыя, словы!

Пётр СУШКО,
студэнт I курса аддзялення журналістыкі.



Апаўшае лісце. Фотаэцюд В. Анцыферава.

